Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_________________ В. А. Богуш
«____» ____________ 2017 г.
Рэгістрацыйны № ТД-______/ тып.

# БЕЛАРУСКАЯ І СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА
## Раздзел І. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

*Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць;*
*напрамкаў спецыяльнасцей:*
*1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў),*
*1-16 01 06-11 Духавыя інструменты (народныя),*
*1-16-01 10-02 Спевы (народныя),*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец),*
*1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец),*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец),*
*1-17 02 01-10 Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец),*
*1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае)*

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік аддзела ўстаноў адукацыі
і работы з творчай моладдзю
Міністэрства культуры Рэспублікі
Беларусь
_______________ А. Р. Гуляева
«____» _________ 2017 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб’яднання па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў Рэспублікі
Беларусь
_______________ Ю. П. Бондар
«____» _________ 2017 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення вышэйшай
адукацыі Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_______________ С. І. Раманюк
«____» _________ 2017 г.

Прарэктар па навукова-метадычнай
рабоце дзяржаўнай установы адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут вышэйшай
школы»
_______________ І. У. Цітовіч
«____» _________ 2017 г.

Эксперт-нормакантралёр
________________________
«____» _____________2017 г.

Мінск
БДУКМ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*В. С. Варапаева,* прафесар кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*Г. М. Друк,* дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*кафедра* беларускай і рускай філалогіі установы адукацыі "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна";
*Ф. В. Драбеня,* намеснік дэкана па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце установы адукацыі "Інстытут журналістыкі БДУ", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
*кафедрай* беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 17.04.2017 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 28.06.2017 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Г. М. Друк

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў па спецыяльнасцях.

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская і сусветная літаратура» складаецца з двух раздзелаў: «Беларуская літаратура» і «Сусветная літаратура». Дадзеная праграма прызначана для вывучэння раздзела «Беларуская літаратура».

У творах літаратуры, як і ў творах іншых відаў мастацтва, фальклору, помніках гісторыі і матэрыяльнай культуры адлюстравана багатае духоўнае жыццё народа, яго невычэрпны талент, высокія гуманістычныя ідэалы. Таму ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй творчага профілю вывучэнне літаратуры як аднаго з відаў мастацтва заўсёды застаецца актуальным. Пры выкладанні беларускай літаратуры як часткі сусветнай літаратуры ўлічваецца яе цесная сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі, такімі як «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», «Культуралогія», інтэграваны модуль «Гісторыя» і інш.

*Мэта* выкладання вучэбнай дысцыпліны – пашырыць веды студэнтаў пра нацыянальны літаратурны працэс, агульныя кірункі яго развіцця, эвалюцыю метадаў, стыляў, жанраў, пазнаёміць з асаблівасцямі развіцця сучаснай беларускай літаратуры.

*Задачы* выкладання вучэбнай дысцыпліны:

– навучыць студэнтаў арыентавацца ў свеце мастацкіх з’яў;

– развіваць эстэтычны густ, адчуванне прыгожага ў жыцці і ў літаратуры;

– садзейнічаць развіццю моўнай культуры;

– спрыяць выпрацоўцы навыкаў прафесійнага аналізу мастацкіх з’яў.

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская і сусветная літаратура» арыентавана на духоўнае ўзбагачэнне асобы, выпрацоўку маральна-эстэтычных ідэалаў, развіццё творчага і навуковага мыслення.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– месца і ролю мастацкай літаратуры ў культуралагічным кантэксце;

– спецыфіку мастацкай літаратуры як формы спасціжэння свету;

– сувязі і ўзаемаўплывы літаратуры з іншымі відамі мастацтва;

– творчасць яркіх прадстаўнікоў кожнай з мастацкіх эпох;

*умець:*

– характарызаваць літаратурную эпоху і асноўныя этапы яе развіцця, літаратурныя напрамкі;

– вызначаць спецыфіку нацыянальнага літаратурнага працэсу;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– успрымаць літаратурны твор ва ўзаемасувязі гісторыі і сучаснасці;
– самастойна аналізаваць мастацкі твор і творчасць пісьменніка;
– выкарыстоўваць набытыя веды ў прафесійнай практыцы;
*валодаць:*
– метадамі культурна-гістарычнага аналізу літаратурнага працэсу;
– асноўнымі паняццямі і катэгорыямі мастацкай інтэрпрэтацыі твора.

Аб'ект вывучэння дысцыпліны – беларуская літаратура, класічная і сучасная. Прадмет – тэматыка, праблематыка, жанравая сістэма, стылі, паэтыка мовы мастацкіх твораў.

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі ведаў у галіне беларускага літаратуразнаўства і фарміраванні ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных філалагічных задач, вылучаюцца наступныя:
– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;
– праектнае навучанне;
– модулевае навучанне;
– праблемнае навучанне;
– метад актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;
– тлумачальна-ілюстратыўныя тэхналогіі навучання;
– метад уключанага назірання.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы па спецыяльнасці *1-17 01 05 «Рэжысура свят (па напрамках)»* павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-9. Умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі;

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і сусвету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў;

**прафесійных кампетэнцый:**

ПК-19. Ладзіць арганізацыю і правядзенне маштабных фестываляў на адкрытай прасторы, прысвечаных актуальным пытанням сучаснага грамадства.

ПК-21. Вызначаць актуальныя праблемы ў галіне рэжысуры свят і прапаноўваць шляхі іх вырашэння.

Пк-22. Распрацоўваць анкеты для збору звестак па праблемах развіцця і захавання народнай творчасці, запатрабаванасці ў соцыуме свят разнастайных накірункаў.

ПК-24. Ажыццяўляць навукова-эксперыментальную работу ў галіне рэжысуры свят.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы па спецыяльнасці *1-17 03 01 «Мастацтва эстрады (па напрамках)»* павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-9. Умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі;

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-6. Умець працаваць у калектыве.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і сусвету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў;

**прафесійных кампетэнцый:**

ПК-14. Карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі для азнаямлення з нарматыўнай базай адукацыі і інавацыямі ў навучанні.

ПК-15. Удасканальваць сваё педагагічнае майстэрства.

ПК-28. Карыстацца сучаснымі інфармацыйнымі рэсурсамі.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы па спецыяльнасці *1-18 01 01 «Народная творчасць (па напрамках)»* павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і творчых задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі.

АК-11. Валодаць здольнасцю прадстаўляць сучасную карціну свету на аснове цэласнай сістэмы гуманітарных ведаў, арыентавацца ў каштоўнасцях быцця, жыцці, культуры;

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

САК-8. Праяўляць ініцыятыву, у т.л. у нестандартных сітуацыях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-9. Удасканальваць і развіваць свой інтэлектуальны і агульны ўзровень, маральна і фізічна ўдасканальваць сваю асобу.

САК-10. Фарміраваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю;

**прафесійных кампетэнцый:**

ПК-21. Удасканальваць методыкі работы з творчымі калектывамі, распрацоўваць вучэбныя праграмы, вучэбна-метадычныя комплексы і іншую вучэбную літаратуру.

ПК-22. Арганізоўваць работу навукова-метадычных канферэнцый па праблемах развіцця народнай творчасці.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы па спецыяльнасці *1-21 04 01 «Культуралогія (па напрамках)»* павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі ў галіне культуралогіі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне культуралогіі;

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. З павагай і беражліва ставіцца да гістарычнай спадчыны і культурных традыцый, талерантна ўспрымаць сацыяльныя і культурныя адрозненні.

САК-8. Удасканальваць і развіваць свой інтэлектуальны і агульны ўзровень, фізічна і маральна ўдасканальваць сваю асобу.

САК-9. Фарміраваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**прафесійных кампетэнцый:**

ПК-11. Працаваць з вучэбнымі планамі і праграмамі, метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі працэсу навучання і выхавання.

ПК-13. Улічваць псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў і практыкаваць індывідуальны падыход да вырашэння мэт і задач навучання і выхавання.

ПК-15. Рыхтавацца да бягучых форм кантролю (тэстаў, калоквіумаў, удзелу ў канферэнцыях, чытаннях і г.д.).

ПК-17. Удасканальваць сваё педагагічнае майстэрства.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы па спецыяльнасці *1-23 01 14 «Сацыяльна-культурная дзейнасць»* павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця, самастойна прымаць прафесійныя рашэнні, аналізаваць гістарычныя і сучасныя праблемы эканамічнага і сацыякультурнага жыцця грамадства;

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным да ўзаемадзеяння, супрацоўніцтва, разумнага кампрамісу падчас вырашэння інавацыйных праблем;

**прафесійных кампетэнцый:**

ПК-1. Далучаць розныя групы насельніцтва і асобных індывідаў да працэсу стварэння, засваення, збераджэння і распаўсюджання каштоўнасцей культуры.

ПК-2. Выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры.

ПК-9. Ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сферы культуры і мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-10. Прагназаваць, планаваць і арганізоўваць інавацыйна-метадычную і мастацка-творчую дзейнасць у сферы культуры і мастацтваў.

ПК-11. Выяўляць інтарэсы і патрэбы насельніцтва ў розных відах вольнах часу.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы па напрамку спецыяльнасці *1-15 02 01-07 «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў)»* павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды ў галіне мастацкіх, навукова-тэхнічных, грамадскіх, гуманітарных, эканамічных дысцыплін і прымяняць іх для вырашэння тэарэтычных і практычных задач прафесійнай дзейнасці.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-11. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі навыкамі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навуковай дзейнасці.

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці і развітым пачуццём патрыятызму.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных перакананняў;

**прафесійных кампетэнцый:**

ПК-8. Рэгуляваць адносіны і ўзаемадзеянні ў педагагічным працэсе.

ПК-10. Карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі для азнаямлення з нарматыўнай базай адукацыі і інавацыямі ў дыдактыцы навучання.

ПК-11. Удасканальваць сваё педагагічнае майстэрства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-26. Карыстацца сучаснымі сродкамі тэлекамунікацый і глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы па напрамку спецыяльнасці *1-16 01 06-11 «Духавыя інструменты (народныя)»* павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць атрыманыя навукова-тэарэтычныя веды ў практычнай дзейнасці выканаўцы і выкладчыка для вырашэння прафесійных задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі, сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-20. Валодаць сродкамі самастойнага, правільнага выкарыстання метадаў фізічнага выхавання і ўмацавання здароўя для забеспячэння паўнацэннай сацыяльнай і прафесійнай дзейнасці;

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці і развітым пачуццём патрыятызму.

САК-2. Валодаць высокай духоўнасцю.

САК-3. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-4. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-6. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-7. Умець працаваць у камандзе;

**прафесійных кампетэнцый:**

ПК-13. Сістэматычна працаваць над ростам педагагічнага майстэрства, карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі для азнаямлення з нарматыўнай базай адукацыі і інавацыямі ў дыдактыцы навучання.

ПК-18. Арганізоўваць працу навукова-метадычных канферэнцый па праблемах вывучэння і захавання народна-духавых інструментальных традыцый.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы па спецыяльнасці *1-16 01 10-02 «Спевы (народныя)»* павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

АК-1. Умець выкарыстоўваць атрыманыя навукова-тэарэтычныя веды ў практычнай дзейнасці выканаўцы і выкладчыка для вырашэння прафесійных задач.

АК-2. Валодаць культурай мыслення.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-7. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-19. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць рашэнне задач, інавацыйна-метадычнай і навуковай дзейнасці;

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

САК-3. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння на падставе прынятых маральных і прававых норм, дэманструючы павагу і талерантнасць да іншых культур.

САК-4. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Валодаць навыкамі здаровага ладу жыцця.

САК-6. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-7. Умець працаваць у камандзе;

**прафесійных кампетэнцый:**

ПК-31. Аналізаваць сучасны стан, перспектывы і кірункі захавання і развіцця народна-песеннай творчасці.

ПК-32. Здзяйсняць нагляд за ўмовамі бытавання розных відаў і жанраў песеннага фальклору ў мэтах яго захавання і пераемнасці.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы па спецыяльнасці *1-17 02 01 «Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках)»* павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі.

АК-11. Валодаць здольнасцю прадстаўляць сучасную карціну свету на аснове цэласнай сістэмы гуманітарных ведаў, арыентавацца ў каштоўнасцях быцця, жыцці, культуры;

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

САК-8. Праяўляць ініцыятыву і крэатыўнасць, у т.л. у нестандартных сітуацыях.

САК-9. Удасканальваць і развіваць свой інтэлектуальны, агульны ўзровень, маральна і фізічна ўдасканальваць сваю асобу.

САК-10. Фарміраваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю;

**прафесійных кампетэнцый:**

ПК-21. Фарміраваць духоўныя і маральныя каштоўнасці, ідэал асобы на падставе духоўных, гістарычных і нацыянальных, культурных традыцый, спрыяць творчай рэалізацыі навучэнцаў, рыхтуючы іх да выканання пэўных сацыяльных роляў у сучасным грамадстве.

ПК-27. Вывучаць, абагульняць практычны і тэарэтычны вопыт айчыннага і замежнага харэаграфічнага мастацтва.

ПК-29. Распрацоўваць вучэбна-метадычныя матэрыялы, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, ажыццяўляць метадычныя распрацоўкі па адпаведных вучэбных дысцыплінах.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы па спецыяльнасці *1-21 04 02-05 «Мастацтвазнаўства (інтэграванае)»* павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

АК-6. Валодаць дысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

АК-14. Аналізаваць і разумець светапоглядныя, сацыяльныя і асобасна-значымыя філасофскія праблемы;

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

САК-7. Фарміраваць і аргументаваць асабістыя меркаванні і прафесійную пазіцыю.

САК-8. З павагаю і беражліва адносіцца да гістарычнай спадчыны і культурных традыцый, талерантна ўспрымаць сацыяльныя і культурныя адрозненні.

У адпаведнасці з тыпавымі вучэбнымі планамі на вывучэнне дысцыпліны «Беларуская і сусветная літаратура» максімальна прадугледжана 264 гадзіны, з якіх 102 гадзіны – аўдыторныя заняткі (56 г. – лекцыі, 46 г. – семінары).

На вывучэнне раздзела «Беларуская літаратура» для спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках) і напрамкаў спецыяльнасцей 1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў), 1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец), 1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец), 1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец), 1-17 02 01-10 Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец), 1-18 01 01-03 Народная творчасць (тэатральная), 1-18 01 01-04 Народная творчасць (народныя рамёствы), 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор) усяго адведзена 130 гадзін, з якіх 50 гадзін – аўдыторныя заняткі (30 г. – лекцыі, 20 г. – семінары).

На вывучэнне раздзела «Беларуская літаратура» для спецыяльнасцей 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках), 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках), 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць і напрамкаў спецыяльнасцей 1-16 01 06-11 Духавыя інструменты (народныя), 1-16 01 10-02 Спевы (народныя), 1-18 01 01-01 Народная творчасць (харавая музыка), 1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка), 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае) усяго адведзена 116 гадзін, з якіх 42 гадзіны – аўдыторныя заняткі (24 г. – лекцыі, 18 г. – семінары).

Рэкамендуемыя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік, экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН**

*для спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках), напрамкаў спецыяльнасцей: 1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў), 1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец), 1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец), 1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец), 1-17 02 01-10 Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец), 1-18 01 01-03 Народная творчасць (тэатральная), 1-18 01 01-04 Народная творчасць (народныя рамёствы), 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Раздзелы, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | сем. зан. |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | |
| **Раздзел І. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА XI–XIX стст.** | | | |
| *Тэма 1.* Літаратура XI–XVIII стст. | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 2.* Літаратура XIX ст. | 6 | 4 | 2 |
| **Раздзел ІІ. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА XX – ПАЧАТКУ XXI ст.** | | | |
| *Тэма 3.* Літаратурны працэс пачатку XX ст. («нашаніўскі перыяд») | 8 | 4 | 4 |
| *Тэма 4.* Літаратура 20–30-х гг. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Літаратура Заходняй Беларусі | 2 | 2 | |
| *Тэма 6.* Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (1945–1955 гг.) | 2 | 2 | |
| *Тэма 7.* Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства (другая палова 50-х – 60-я гг.) | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 8.* Літаратура 70 – першай паловы 80-х гг. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 9.* Сучасны літаратурны працэс (другая палова 80-х гг. XX ст. – пачатак XXI ст.) | 10 | 6 | 4 |
| **Разам…** | **50** | **30** | **20** |

**ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН**

*для спецыяльнасцей 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць,*
*напрамкаў спецыяльнасцей:*
*1-16 01 06-11 Духавыя інструменты (народныя),*
*1-16 01 10-02 Спевы (народныя),*
*1-18 01 01-01 Народная творчасць (харавая музыка),*
*1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка),*
*1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае)*

| Раздзелы, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | сем. зан. |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | |
| **Раздзел І. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА XI–XIX стст.** | | | |
| *Тэма 1.* Літаратура XI–XVIII стст. | 2 | 2 | |
| *Тэма 2.* Літаратура XIX ст. | 4 | 2 | 2 |
| **Раздзел ІІ. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА XX – ПАЧАТКУ XXI ст.** | | | |
| *Тэма 3.* Літаратурны працэс пачатку XX ст. («нашаніўскі перыяд») | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Літаратура 20–30-х гг. | 2 | | 2 |
| *Тэма 5.* Літаратура Заходняй Беларусі | 2 | 2 | |
| *Тэма 6.* Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (1945–1955 гг.) | 2 | 2 | |
| *Тэма 7.* Літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства (другая палова 50-х – 60-я гг.) | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 8.* Літаратура 70 – першай паловы 80-х гг. | 8 | 2 | 6 |
| *Тэма 9.* Сучасны літаратурны працэс (другая палова 80-х гг. XX ст. – пачатак XXI ст.) | 10 | 6 | 4 |
| **Разам…** | **42** | **24** | **18** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Змест і задачы вывучэння дысцыпліны. Перыядызацыя і характарыстыка асноўных літаратурных эпох і этапаў развіцця беларускай літаратуры.

Нацыянальнае мастацтва слова і сусветны культурны вопыт. Міжнародныя літаратурныя сувязі і кантакты. Перакладчыкі і папулярызатары беларускай мастацкай літаратуры за мяжой (В. Жыдліцкі, Н. Вылчаў, Ф. Няўважны, Е. Путрамант і інш.). Беларуская літаратура замежжа, найбольш значныя кнігі і аўтары, іх дзейнасць у агульнанацыянальным культурным кантэксце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел I. ЛІТАРАТУРА XI–XIX стст.

*Тэма 1. Літаратура XI–XVIII стст.*

Гісторыка-культурны феномен старажытнай беларускай літаратуры. Перадумовы ўзнікнення і асаблівасці развіцця, спецыфіка старажытнай беларускай літаратуры. Сацыякультурная, ідэалагічная, выхаваўчая функцыі літаратуры ў старажытнасці.

Літаратура Старажытнай Русі (XI – першая палова XIII ст.) як адна з сярэдневяковых літаратур Еўропы. Перакладная літаратура (Біблія, патрыстыка, апокрыфы, варажбітныя кнігі, хронікі). Арыгінальная літаратура (агіяграфія, летапісанне, малітоўная паэзія). Культурна-асветніцкая дзейнасць Е.Полацкай. Вобраз асветніцы ў «Жыціі Еўфрасінні Полацкай», сучаснай літаратуры, беларускім выяўленчым мастацтве, скульптуры. Жыццёвы шлях і мастацкая спадчына Кірылы Тураўскага ў ацэнцы сучаснай навукі. «Слова пра паход Ігаравы» як узор усходнеславянскага гераічнага эпасу.

Літаратура перыяду станаўлення ВКЛ (сярэдзіна XIII–XIV ст.). Сярэдневяковы рыцарскі раман і яго ўплыў на развіццё беларускай літаратуры. Летапісанне ў Беларусі («Баркулабаўская хроніка», «Летапіс Вялікіх князёў літоўскіх», «Хроніка Быхаўца» і інш.).

Літаратура перыяду Рэнесансу. Культуралагічнае значэнне дзейнасці Ф. Скарыны і яго паслядоўнікаў. «Песня пра зубра» М. Гусоўскага: роздум аўтара пра лёс хрысціянскай Еўропы, культура міжнародных зносін у творы, ідэя асветы і розуму як асновы чалавечай культуры.

Літаратура перыяду барока і Асветніцтва (XVII–XVIII стст.). С. Полацкі як пісьменнік-эксперыментатар. Народны тэатр. Батлейка.

Школьны тэатр. К. Марашэўскі і яго «Камедыя». Прыдворны тэатр. Творчасць У. Ф. Радзівіл.

*Тэма 2. Літаратура XIX ст.*

Станаўленне рамантызму ў беларускай літаратуры. Творчасць філаматаў. *А. Міцкевіч.* Класіцызм і пераход да рамантызму (на матэрыяле твораў «Гражына», «Дзяды», інш.). Паэма «Пан Тадэвуш». Вобразная сістэма твора. Жыццё шляхты. Сюжэтныя лініі. Уплыў А. Міцкевіча на творчасць *Я. Чачота.*

Літаратура 20–40-х гг. XIX ст.: тэма роднага краю, антыпрыгонніцкія матывы, сувязь з фальклорам, гумар у творах, ананімная літаратура (паэмы, гутаркі). *Я. Баршчэўскі.* Мастацкі міфалагізм, маральна-этычная і сацыяльна-грамадская праблематыка ў творчасці («Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях», «Драўляны Дзядок і кабета Інсекта», «Душа не ў сваім целе»).

Беларуская літаратура 50–70-х гг. XIX ст. Фарміраванне трох цэнтраў беларускага літаратурна-грамадскага руху: у Мінску – В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, С. Манюшка, П. Шпілеўскі; Вільні – У. Сыракомля, В. Каратынскі, А. Кіркор; Віцебску – А. Вярыга-Дарэўскі, А. Рыпінскі. Асветніцка-публіцыстычны характар літаратуры. *В. Дунін-Марцінкевіч.* Асоба пісьменніка. Тэатральна-музычнае жыццё Беларусі ў сярэдзіне XIX ст. і творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча (лібрэта оперы «Ідылія»). Фарс-вадэвіль «Пінская шляхта» – наватарскі твор. Сінтэз рамантызму, сентыменталізму, рэалізму ў яго творах. *У. Сыракомля.* Жанр вершаванай гутаркі (гавэнды) у творчасці («Паштальён», «Хадыка», «Ілюмінацыя»). Мастацкая публіцыстыка *К. Каліноўскага.*

Беларуская літаратура 80–90-х гг. XIX ст. Перыяд фарміравання беларускай самасвядомасці і тэарэтычнага абгрунтавання нацыянальнай беларускай ідэі. Развіццё рэалізму. *Ф. Багушэвіч.* «Прадмова» да зборніка «Дудка беларуская» (1891) як маніфест беларускага адраджэнскага руху. Спалучэнне нацыянальнай, сацыяльнай і маральнай праблематыкі ў творчасці. Ф.Багушэвіч як заснавальнік крытычнага рэалізму. Паслядоўнікі Ф.Багушэвіча.

## Раздзел II. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА XX – ПАЧАТКУ XXI ст.

*Тэма 3. Літаратурны працэс пачатку XX ст. («нашаніўскі перыяд»)*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уздым літаратурна-грамадскага руху на пачатку XX ст. (дзейнасць суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца» ў Пецярбургу, культурны рух у Вільні, першыя беларускія газеты «Наша доля» (1906) і «Наша ніва» (1906–1915) і выдавецтвы «Наша хатка», «Беларус» і інш.). Беларуская літаратура «нашаніўскага» перыяду ў агульнаеўрапейскім культурным кантэксце. Роля *К. Каганца, Ядвігіна Ш., У. Цёткі, У. Галубка, С. Палуяна, З. Бядулі, В. Ластоўскага* і інш. у станаўленні і развіцці новай беларускай літаратуры.

*Янка Купала* – паэт, драматург, рэдактар, публіцыст. Мастацкая эвалюцыя Купалы-лірыка (зборнікі «Жалейка», «Гусляр», «Шляхам жыцця», «Спадчына»). Рамантызм творчасці. Ідэя нацыянальнага адраджэння. Філасофія чалавечага жыцця ў паэмах («Курган», «Магіла льва», «Яна і я», «На куццю», На Дзяды», «Адвечная песня», «Сон на кургане»). Драматургія: «Паўлінка» – асаблівасці жанру; «Раскіданае гняздо» як сацыяльна-філасофская драма; трагікамедыя «Тутэйшыя» (1922). Праблема «тутэйшасці» як гістарычная трагедыя Беларусі. Творы Купалы ў іншых відах мастацтва.

*Якуб Колас.* Літаратурная, навуковая, педагагічная, грамадзянская дзейнасць. Паэтычны зборнік «Песні жальбы». Станаўленне Коласа-празаіка (ад фрагментарнасці, фальклорна-бытавой асновы да псіхалагізму і філасафічнасці). Спецыфіка мыслення ў «Казках жыцця». Паэма «Новая зямля»: ідэйны змест, энцыклапедызм, нацыянальна-культурны свет беларуса. Паэма «Сымон-музыка» як алегарычнае ўвасабленне гістарычнага лёсу нацыянальнага мастацтва.

*Максім Багдановіч* – феномен асобы і таленту. «Вянок» (1913) як класічная кніга беларускай лірыкі пачатку XX ст. Пазнанне дыялектыкі ўзаемаадносін чалавека і прыроды («Згукі Бацькаўшчыны»), гісторыя беларускай культуры ў паэтычных вобразах («Старая Беларусь»), асваенне ўрбаністычнай тэмы («Места»), услаўленне грамадскай актыўнасці («Думы», «Вольныя думы»), узвелічэнне роднага слова праз выяўленне яго паэтычных магчымасцей («Старая спадчына»), пошук ідэалу кахання («Мадонны», інш.). Праблема красы ў эстэтыцы М. Багдановіча (апавяданні «Музыка», «Апокрыф», «Апавяданне аб іконніку і залатару» і інш.). Спалучэнне ў творчасці нацыянальных і агульнаеўрапейскіх традыцый.

### *Тэма 4. Літаратура 20–30-х гг.*

Творчыя аб’яднанні («Маладняк», «Узвышша», «Полымя», БелАППП і інш.), іх культурна-асветніцкая дзейнасць. Ідэя стварэння новага пралетарскага мастацтва і яе рэалізацыя ў літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паэзія. Вобраз рэвалюцыйнага часу, старой і новай Беларусі ў паэзіі *М. Чарота* («Босыя на вогнішчы», «Карчма»), *П. Труса* («Дзесяты падмурак»), іншых аўтараў. Мастацкая практыка сяброў «Узвышша»: шырокае выкарыстанне фальклору, цікавасць да гістарычнага мінулага, філасафічнасць мыслення, паэтычнае майстэрства, новыя жанравыя формы. Творчыя пошукі *У. Дубоўкі* («Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы», «Штурмуйце будучыні аванпосты»). Захапленне паэтыкай імажынізму *Я. Пушчам.* Тэма мастака і народа («Лісты да сабакі», «Цень Консула», «Сады вятроў»).

Тэматычная разнастайнасць, жанрава-стылявыя пошукі, праблема новага героя ў беларускай прозе. «Маладнякоўскае» апавяданне і яго спецыфіка. Жанравае станаўленне беларускай аповесці і рамана. Аўтабіяграфізм, хранікальнасць, дакументалізм, псіхалагізм у творах *М. Гарэцкага, К. Чорнага, М. Зарэцкага* і інш. Сатырычная плынь у беларускай прозе (творы *Я. Коласа, З. Бядулі, К. Крапівы, А. Мрыя, Л. Калюгі).*

Тэорыя бесканфліктнасці і яе негатыўны ўплыў. Сацрэалізм і яго праявы ў творах 30-х гг. Рэпрэсіраваныя літаратары, іх творчая спадчына.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 5. Літаратура Заходняй Беларусі*

Асноўныя ідэалагічна-культурныя цэнтры і асаблівасці літаратурнага працэсу на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Неаднароднасць літаратурных сіл як вынік розных палітычных і эстэтычных арыенціраў аўтараў.

Бурнае развіццё публіцыстыкі (творчасць *М. Гарэцкага, Б. Тарашкевіча, У. Самойлы, І. Канчэўскага, А. Луцкевіча* і інш.). Сацыяльна-палітычны стан Беларусі, лёс яе дзяржаўнасці як адна з асноўных тэм заходнебеларускай публіцыстыкі.

Развіццё паэзіі. Багацце жанрава-эстэтычных пошукаў у творчасці *А. Салагуба, М. Машары, В. Васілька, М. Танка, П. Пестрака, В. Таўлая, Н. Арсенневай, У. Жылкі, К. Сваяка* і інш.

Заходнебеларуская драматургія і яе прадстаўнікі – *Л. Родзевіч, Ф. Аляхновіч, М. Гарэцкі.* Праявы мадэрнізму ў творах.

Літаратура Заходняй Беларусі як асобны раздзел агульнанацыянальнай мастацкай спадчыны.

### *Тэма 6. Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя (1945–1955 гг.)*

З'яўленне тэмы будучай вайны ў літаратуры і мастацтве (песні, кнігі, кінафільмы) напярэдадні Другой сусветнай вайны.

Неадпаведнасць пачатку вайны ўяўленням пра яе характар і ход. Ваенныя дарогі беларускіх пісьменнікаў, абарваныя вайной жыцці.

Перавага публіцыстычных жанраў (артыкулы *Я. Коласа, К. Чорнага, К. Крапівы, М. Лынькова* і інш.), лірыкі (шырокае бытаванне балады і вершаў баладнага тыпу). Развіццё «малых» жанравых форм у беларускай мастацкай прозе. Паказ гераізму і патрыятызму савецкага чалавека. Зборнікі апавяданняў *М. Лынькова* «Астап», *К. Чорнага* «Маленькая жанчына». Раманы *К. Чорнага* «Пошукі будучыні», «Млечны шлях» як адметная мастацкая з'ява ў беларускай літаратуры.

Перыяд вайны як час выпрабавання грамадзянскіх і эстэтычных вартасцей беларускай паэзіі (на прыкладзе твораў *А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі, П. Броўкі* і інш.). Абвостранае пачуццё радзімы, пошукі духоўнай падтрымкі ў мінулым народа, актуалізацыя традыцый вуснай народнай творчасці ў паэтыцы як тыповыя рысы лірыкі гэтага перыяду.

Дасягненні і супярэчнасці развіцця паэтычнага эпасу ў пасляваенны перыяд (*М. Танк* «Люцыян Таполя», *П. Броўка* «Хлеб», *А. Куляшоў* «Новае рэчышча» і інш.).

Тэматычныя аспекты ў драматургічных творах *К. Крапівы* («З народам», «Мілы чалавек», «Пяюць жаваранкі»), *А. Макаёнка* («Выбачайце, калі ласка»), інш.

*Тэма 7. Беларуская літаратура перыяду дэмакратычнага абнаўлення грамадства (другая палова 50-х–60-я гг.)*

Матывы чалавечага і творчага самаачышчэння, абвастрэнне пачуцця асабістай адказнасці за сацыяльныя перамены, заглыбленне ў грамадска-палітычныя і маральна-этычныя праблемы, пераацэнка творчых здабыткаў і выпрацоўка новых эстэтычных крытэрыяў у творчасці паэтаў старэйшага пакалення. Арганічная спалучанасць нацыянальнага з агульначалавечым, сучаснасці з мінулым, беларускага фальклору з культурай сусветнай цывілізацыі ў творчасці *М. Танка* (зб. «Мой каўчэг», «Errata»). Роздум *А. Куляшова* над лёсам чалавека, народа, чалавечай цывілізацыі («Новая кніга», «Цунамі», «Варшаўскі шлях», інш.). Вечныя праблемы і своеасаблівасць іх мастацкага вырашэння ў паэзіі *П. Панчанкі* (зб. «І вера, і вернасць, і вечнасць», «Горкі жолуд», «Высокі бераг»).

Лірызацыя прозы як своеасаблівы каталізатар праўдзівасці ў мастацкай літаратуры, новае разуменне ролі асобы ў гісторыі, увага да духоўнага свету чалавека. Культура слова ў лірычнай прозе *Я. Брыля, М. Стральцова* і інш. Развіццё аповесці і нарысу, актуалізацыя жанру

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускага рамана ў 60-я гг. Вайна і вёска як дзве магістральныя тэмы ў беларускай прозе.

Прыход у літаратуру «філалагічнага» пакалення пісьменнікаў (*Н. Гілевіч, Г. Бураўкін, Р. Барадулін, Я. Сіпакоў, А. Вярцінскі, В. Зуёнак* і інш.). Тэматычная і жанрава-стылявая разнастайнасць, эстэтычнае абнаўленне літаратуры (узрастанне мастацка-аналітычнай глыбіні асэнсавання жыцця, часу, гісторыі, паварот да рэальных праблем рэчаіснасці, канфліктаў, узвышэнне маральна-этычнай каштоўнасці народнага жыцця, ідэалаў праўды і гуманізму).

*Тэма 8. Літаратура 70 – першай паловы 80-х гг.*

Спроба пераадолення сацрэалістычнага мыслення праз усталяванне новых форм узаемадачыненняў з часам: свядомая настроенасць на цвярозы роздум аб свеце, на павелічэнне долі рацыянальнага за кошт змяншэння пафаснага асэнсавання рэчаіснасці.

Актуалізацыя жанру аповесці і рамана ў прозе. Творчасць пісьменнікаў ваеннага пакалення *І. Навуменкі, І. Шамякіна* і пісьменнікаў пакалення «дзяцей вайны» *Б. Сачанкі, В. Казько, І. Пташнікава, В. Адамчыка, І. Чыгрынава* і інш. Роля *В. Быкава* ў раскрыцці тэмы вайны і іншых трагічных падзей савецкай гісторыі, экзістэнцыяльна-прытчавае гучанне яго твораў («Мёртвым не баліць», «Круглянскі мост», «Пакахай мяне, салдацік», «Ваўчыная яма», «Труба», зб. «Сцяна», «Пахаджане»). Мастацкае асэнсаванне «ваенна-вясковай» тэмы ў творчасці *А. Карпюка, А. Кудраўца, А. Жука, В. Карамазава, А. Асіпенкі* і інш.

Узбагачэнне беларускай паэзіі, прозы і драматургіі літаратурнай дзейнасцю *У. Караткевіча,* неардынарнасць яго творчай асобы (літаратар, мастак, сцэнарыст, інш.). Культуралагічныя аспекты яго творчасці, сінтэз нацыянальнага і агульначалавечага ў ёй (зб. «Матчына душа», «Вячэрнія ветразі», «Мая Іліяда», «Быў. Ёсць. Буду»; «Дзікае паляванне караля Стаха», «Чорны замак Альшанскі», «Ладдзя роспачы» і інш.). Асоба У. Караткевіча і сусветнае мастацтва.

Імкненне да творчага самавыяўлення, адстойванне ўласнага «я» і эстэтычнага пошуку ў паэзіі пакалення «сямідзесятнікаў» *Я. Янішчыц, Р. Баравіковай, К. Камейшы, В. Яраца* і інш. Інтэлектуалізм і форматворчасць у паэзіі *А. Разанава.*

Творчасць *А. Макаёнка* як рэнесанс беларускай драматургіі, актуальнасць яго твораў («Зацюканы апостал», «Трыбунал», «Таблетку пад язык», «Святая прастата»). Драмы *А. Дударава* («Радавыя»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Парог», «Вечар»), камедыі *К. Крапівы* («Брама неўміручасці»), *М. Матукоўскага* («Амністыя»).

*Тэма 9. Сучасны літаратурны працэс (другая палова 80-х гг. XX ст. – пачатак XXI ст.)*

Зрухі ў грамадска-палітычным жыцці ў другой палове 80-х гг. XX ст. і іх уплыў на развіццё літаратуры (вяртанне забароненых імёнаў і твораў, тэма адраджэння, грамадзянска-патрыятычныя і гістарычныя матывы, уключэнне ў літаратурны працэс твораў эміграцкай літаратуры, інш.).

Шматтэмнасць, мнагапланавасць праблематыкі, жанрава-стылявая разнастайнасць сучаснай прозы. Мастацка-дакументальная проза (А. Адамовіч, Я. Брыль, С. Грахоўскі, Л. Геніюш, В. Карамазаў, С. Алексіевіч і інш.), гістарычная (Л. Дайнека, У. Арлоў, В. Іпатава, К. Тарасаў, Л. Рублеўская, А. Наварыч і інш.), фантастычна-прытчавая (В. Гігевіч, Я. Сіпакоў, П. Місько, Р. Баравікова і інш.), сацыяльная і псіхалагічна-філасофская (І. Шамякін, Ю. Станкевіч, В. Казько, А. Федарэнка, А. Брава і інш.), міфалагічная (В. Казько, А. Казлоў і інш.), прыгодніцка-дэтэктыўная і інш. Эксперыменты ў сферы форматворчасці і стылю (Ю. Станкевіч, А. Глобус, Б. Пятровіч, Л. Рублеўская, А. Бахарэвіч, С. Балахонаў, Ю. Каляда і інш.).

Грамадзянска-публіцыстычнае гучанне лірыкі паэтаў-шасцідзесятнікаў і «сямідзесятнікаў» (Н. Гілевіч, Г. Бураўкін, С. Законнікаў, М. Мятліцкі, У. Някляеў і інш.), рэлігійна-хрысціянскія матывы (Р. Барадулін і інш.), развіццё беларускай паэзіі ў рэчышчы еўрапейскага мастацкага вопыту (Л. Дранько-Майсюк, Л. Рублеўская, А. Разанаў і інш.). Жанравае і кампазіцыйнае абнаўленне паэзіі (хоку, трыялеты, вянкі санетаў, паліндромы, рубаі і інш., аўтарскія жанры). Постмадэрнісцкія матывы ў паэтычнай творчасці А. Хадановіча, В. Жыбуля, С. Мінскевіча і інш.

Драматургічны вопыт А. Петрашкевіча, М. Матукоўскага, С. Кавалёва, П. Васючэнкі і інш. Традыцыі і эксперыменты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Багдановіч, І. Э.* Авангард і традыцыя: беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Э. Багдановіч. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – 378 с.

2. *Бельскі, А. І.* Беларуская літаратура XX ст.: гісторыя і сучаснасць / А. І. Бельскі. – Мінск : Аверсэв, 2005. – 270 с.

3. Гісторыя беларускай літаратуры, XI – XIX стст. : у 2 т. / НАН Беларусі, Ін-т імя Я. Купалы; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2006—2007. – 2 т.

4. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. : І. Я. Навуменка, В. А. Каваленка. – Мінск : Бел. навука, 1999–2003. – 4 т.

5. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : У 4 т. Т.4. Кн. 3 / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр даслед. бел. культуры, мовы і літ.; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 1341 с.

6. Гісторыя беларускай літаратуры, XIX – пачатак XX ст. : Падруч. для філал. спец. выш. пед. навуч. устаноў / І. Э. Багдановіч, У. В. Гніламёдаў, Л. С. Голубева і інш.; пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 1998. – 559 с.

7. Гісторыя беларускай літаратуры : XX стагоддзе (20-50-я гг.): падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / У. В. Гніламёдаў, В. В. Казлова, М. А. Лазарук і інш.; пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 2000. – 510 с.

8. Гісторыя беларускай літаратуры : Старажыт. перыяд: падруч. для філал. спец. пед. выш. навуч. устаноў / М. М. Грынчык, У. А. Калеснік, У. Г. Кароткі і інш.; пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мінск : Выш. шк., 1996. – 351 с.

9. Гісторыя беларускай літаратуры, XIX – пачатак XX ст. : падручнік для філал. фак. пед. інст. БССР / [Л. С. Голубева і інш.]; пад агульнай рэдакцыяй М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мінск : Выш. школа, 1981. – 412 с.

10. *Лойка, А. А.* Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд: падруч. для філал. фак. выш. навуч. устаноў БССР: у 2 ч. / А. А. Лойка. – Мінск: Выш. школа, 1989. – 2 ч.

11. *Сінькова, Л. Д.* Паміж тэкстам і дыскурсам: беларуская літаратура XX-XXI стст. : гісторыя, кампаратывістыка і крытыка (літаратурная крытыка, артыкулы, гутаркі) / Людміла Сінькова. – Мінск : Паркус плюс, 2013. – 292 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. *Хаўстовіч, М. В.* Гісторыя беларускай літаратуры 30-40-х гг. XIX ст. : дапам. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / М. В. Хаўстовіч. – Мінск : Бел. дзярж. ун-т, 2001. – 169 с.

*Дадатковая*

1. *Арлоў, У.* Еўфрасіння Полацкая / У. Арлоў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 220 с.
2. *Арочка, М. М.* На парозе 90-х : Літаратурны агляд / М. М. Арочка, П. К. Дзюбайла, С. С. Лаўшук ; рэд. В. П. Жураўлёў ; АН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 206 с.
3. *Афанасьеў, І. М.* Чарнобыльскае светаадчуванне ў сучаснай беларускай літаратуры / І. М. Афанасьеў. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 128 с.
4. *Банцэвіч, П. К.* Творчасць У. Караткевіча ў кантэксце культуралогіі: манаграфія / П. К. Банцэвіч. – Гродна: ГДАУ, 2007. – 310 с.
5. *Баршчэўскі, Л.* Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына. – Мінск : Радыёла–плюс, 2006. – 574 с.
6. *Бугаёў, Д. Я.* Жыццём ідучы: з гісторыі беларускай літаратуры і літаратурнай крытыкі / Д. Я. Бугаёў. – Мінск : БГУ, 2013. – 303 с.
7. *Бугаёў, Д. Я.* Праўда і мужнасць таленту: Выбранае: Кніга пра Васіля Быкава. Артыкулы. Дыялог. — Мінск : Маст. літ., 1995. – 415 с.
8. *Васючэнка, П. В.* Беларуская літаратура XX ст. і сімвалізм / П. В. Васючэнка. – Мінск: МДЛУ, 2004. – 154 с.
9. *Васючэнка, П. В.* Сучасная беларуская драматургія: дапам. для настаўнікаў / П. В. Васючэнка. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 156 с.
10. *Гаранін, Л. Я.* Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 176 с.
11. *Гніламёдаў У.* Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларускую паэзію. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 246 с.
12. *Дасаева, Т.М.* Беларуская літаратура XX – пачатку XXI стагоддзя : вучэбны дапаможнік для студэнтаў установ вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях “Журналістыка міжнародная”, “Журналістыка (па напрамках)”, “Літаратурная работа (па напрамках)”, “Інфармацыя і камунікацыя”, “Беларуская філалогія” / Т.М. Дасаева. – Мінск : РІВШ, 2016. – 263 с.
13. *Кісліцына, Г. М.* Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы. Навуковае выданне / Г. М. Кісліцына. – Мінск: Логвінаў, 2006. – 415 с.
14. *Кісліцына, Г. М.* Чалавек постмадэрну ў сучаснай беларускай літаратуры / Г. М. Кісліцына, навук. рэд. М. А. Тычына; Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. – Мінск: Права і эканоміка, 2010. – 169 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

15. *Кісялёў, Г.* Ад Чачота да Багушэвіча / Г. Кісялёў. – 2-е выд. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 426 с.

16. *Козіч, В. І.* Чалавек і прырода ў сучаснай беларускай прозе / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы / В. І. Козіч. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 94 с.

17. *Лаўшук, С. С.* На драматургічных скрыжаваннях / С. С. Лаўшук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 160 с.

18. *Локун, В. І.* Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры / В. І. Локун. – Мінск : Тэхнапрынт, 2005. – 227 с.

19. *Локун, В. І.* Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы, 1950–1960-я гг. / В. І. Локун. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 109 с.

20. *Максімовіч, В. А.* Беларускі мадэрнізм: эстэтычная самаідэнтыфікацыя літаратуры пачатку XX ст. / В. А. Максімовіч. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2001. – 226 с.

21. *Мацюхіна, Т. Б.* Беларускі імпрэсіянізм / Т. Б. Мацюхіна ; [навук. рэд. М. А. Тычына]. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 201 с.

22. *Мішчанчук, М. І.* Беларуская літаратура XX ст. : вучэб. дапам. / М. І. Мішчанчук, У. С. Шпакоўскі. – Мінск : Вышэйш. шк., 2001. – 325 с.

23. *Мушынскі, М. І.* Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага / М. І. Мушынскі. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 338 с.

24. Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X – XIX стагоддзі: энцыклапедычны даведнік / гал. рэд. Б. І. Сачанка. – Мінск : БелЭН, 1995. – 672 с.

25. *Назараў, В. Ф.* Тайнапіс Андрэя Мрыя : падтэкст рэалій у творчасці пісьменніка / В. Ф. Назараў ; [навук. рэд. П. В. Васючэнка]. – Мінск : Беларус. навука, 2016. – 358 с.

26. *Саверчанка, І. В.* Старажытная паэзія Беларусі / І. В. Саверчанка. – Мінск : Беларус. навука, 1992. – 254 с.

27. *Савік, Л. С.* Пакліканыя: літаратура беларускага замежжа / Л. С. Савік. – Мінск : Тэхналогія, 2001. – 479 с.

28. *Стральцова, В. М.* Шлях да сябе : Сучасная аўтабіяграфічная проза як сістэма / В. М. Стральцова. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 112 с.

29. *Тычына, М. А.* Карані і крона: Фальклор і літаратура / М. А. Тычына. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 197 с.

30. Уладзімір Караткевіч: вядомы і невядомы: зборнік эсэ, вершаў, прысвячэнняў / уклад.: А. Верабей, М. Мінзер, С. Панізнік. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2010. – 365 с.

31. Францыск Скарына і яго час: энцыклапедычны даведнік / гал. рэд. І. П. Шамякін. – Мінск : БелЭН, 1988. – 608 с.

32. *Ханеня, С. І.* Амплітуда мастацкасці: Умоўнасць у беларускай прозе канца XX ст. / С. І. Ханеня ; Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ, 2001. – 117 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

33. *Шынкарэнка, В. К.* Нястомных пошукаў дарога : Прабл. сучас. бел. гіст. прозы / В. К. Шынкарэнка. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 208 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі кампетэнцый студэнта

Ацэнка ведаў і ўменняў студэнтаў выконваецца паэтапна і ўключае апытанне на семінарскіх занятках па вызначанай тэме вучэбнай дысцыпліны і выніковы кантроль у форме заліку ці экзамену. Для ажыццяўлення бягучага кантролю і самакантролю кампетэнцый студэнтаў па дысцыпліне «Беларуская літаратура» можна выкарыстоўваць вусныя і пісьмовыя адказы на пытанні, тэсціраванне, творчыя працы, напісанне рэфератаў, падрыхтоўку дакладаў і прэзентацый, інш.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў па дысцыпліне арганізуецца ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі (рабочыя варыянты). Прадугледжваюцца такія формы работы, як стварэнне літаратурнага дзённіка, выкананне індывідуальных заданняў праблемнага характару, напісанне творчых работ, падрыхтоўка прэзентацый і інш.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з'яўляецца бягучым і ажыццяўляецца праз e-mail, індывідуальныя кансультацыі, на семінарскіх і лекцыйных занятках, падчас заліку ці экзамену.

Выкладчык знаёміць студэнтаў з асаблівасцямі той ці іншай формы самастойнай работы і спосабамі кантролю на ўводнай лекцыі па вучэбнай дысцыпліне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці**

| Балы | Крытэрыі ацэнкі на экзамене |
|---|---|
| 1 (адзін), не залічана | Адсутнасць ведаў і кампетэнцый у рамках вучэбнага курса; адмаўленне ад адказу |
| 2 (два), не залічана | Фрагментарныя веды ў межах вучэбнага курса; наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак |
| 3 (тры), не залічана | Недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах вучэбнага курса; фрагментарны пераказ тэксту; няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію і арыентавацца ў тэорыі літаратурнага працэсу |
| 4 (чатыры), залічана | Валоданне зместам твора пераважна на ўзроўні пераказу, адсутнасць канцэптуальнага ўспрымання літаратурнага працэсу; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі |
| 5 (пяць), залічана | Дастатковы ўзровень ведаў у рамках вучэбнай праграмы; эмацыянальнае асэнсаванне тэксту са спробай ацаніць характары і сітуацыі; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; лагічны адказ і здольнасць рабіць высновы; засваенне асноўнай літаратуры |
| 6 (шэсць), залічана | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; раскрыццё зместу літаратурнага твора праз выяўленне праблематыкі, вобразнай сістэмы; спроба раскрыць аўтарскія адносіны да герояў і падзей пры адсутнасці аналітычнага падыходу; лагічны адказ і здольнасць рабіць высновы; засваенне асноўнай літаратуры |
| 7 (сем), залічана | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; добрае валоданне тэкстам, уменне аналізаваць твор на ідэйна-кампазіцыйным узроўні; здольнасць рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; лагічны і разгорнуты адказ; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |
| 8 (восем), залічана | Сістэматызаваныя, грунтоўныя і трывалыя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; свабоднае валоданне навуковай тэрміналогіяй і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; разуменне і раскрыццё шматузроўневасці мастацкага твора; выкарыстанне цытат; самастойнасць высноў; валоданне метадамі комплекснага аналізу; адказ на дадатковыя пытанні; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |
| 9 (дзевяць), залічана | Сістэматызаваныя, грунтоўныя і трывалыя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; свабоднае валоданне навуковай тэрміналогіяй і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; уменне аналізаваць твор у адзінстве зместу і формы; прадуманы, лагічны, разгорнуты, абгрунтаваны адказ, які не патрабуе дадатковых пытанняў; поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |
| 10 (дзесяць), залічана | Сістэматызаваныя, грунтоўныя і трывалыя веды па ўсіх раздзелах праграмы; свабоднае валоданне навуковай тэрміналогіяй і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; уменне даваць тыпалагічны аналіз, рабіць арыгінальныя высновы; выяўленне аўтарскай канцэпцыі жыцця і асобы; творчая інтэрпрэтацыя тэксту; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БЕЛАРУСКАЯ І СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА**
**Раздзел І. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА**

*Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць;*
*напрамкаў спецыяльнасцей:*
*1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў),*
*1-16 01 06-11 Духавыя інструменты (народныя),*
*1-16-01 10-02 Спевы (народныя),*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец),*
*1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец),*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец),*
*1-17 02 01-10 Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец),*
*1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60х84 1/16.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. . Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ